ISSN 0130 — 8068

2/2008



# ПОЛЫМЯ

Мар'ян Дукса
Уладзімір Марук
Анатоль Аўруцін
Вершы

Алесь Шашкоў
Ціхая Лань
Раман (пачатак)

Ягор Конеў
Грэчкасейная ідылія
Тадэвуша Касцюшкі
Раман (заканчэнне)

Школьныя далягляды
Беларуская навелістыка

Генрых Далідовіч
Сведкі пераломнага часу

Зоп 3372/2008/2

# ПОЛЫМЯ

**2**

**(940)**

**2008**

**люты**

**ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКІ І ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНЫ ЧАСОПІС**

**ВЫДАЕЦЦА СА СНЕЖНЯ 1922 ГОДА**

**Галоўны рэдактар**
**Мікола МЯТЛІЦКІ**

**Рэдакцыйная калегія:**

**Лада АЛЕЙНІК, Навум ГАЛЬПЯРОВІЧ, Уладзімір ГНІЛАМЁДАЎ, Уладзімір ГУСАКОЎ, Марыя ЗАХАРЭВІЧ, Анатоль ЗЭКАЎ, Віктар ІЎЧАНКАЎ, Алесь КАРЛЮКЕВІЧ, Аляксандр ЛУКАШАНЕЦ, Валерый МАКСІМОВІЧ, Алесь МАРЦІНОВІЧ, Уладзімір МАРУК (намеснік галоўнага рэдактара), Зоя МЕЛЬНІКАВА, Віктар ПРАЎДЗІН, Зіновій ПРЫГОДЗІЧ, Уладзімір РУСАКЕВІЧ, Іван САВЕРЧАНКА, Алесь САВІЦКІ, Міхаіл САВІЦКІ, Таццяна ШАМЯКІНА.**

Установа культуры «Абласная бібліятэка імя М. Горкага» г. Брэст

**РЭДАКЦЫЙНА-ВЫДАВЕЦКАЯ ЎСТАНОВА «ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»**

**Мінск 2008**

Аддзел бягучых перыядычных выданняў

# ЗМЕСТ

3 **Алесь ШАШКОЎ. Ціхая Лань.** Раман.

39 **Мар'ян ДУКСА. Максім Багдановіч. ***Жыццё цябе нясе... ***Такая ўверсе цішыня і гладзь... ***Ты рады стрэчы ці не рады?.. ***Нібы ў пустым заглушаным сцяпенні... ***Нязбытных мрояў цяжкі скрутак... ***Я думак рой разварушыў... ***Дзень, затрымайся хоць крышку... ***Мо выбіўся з сілы наш лёс-ледакол... ***Цягнуць цябе, як спакуснікі, шанцы...** Вершы.

44 **Ягор КОНЕЎ. Грэчкасейная ідылія Тадэвуша Касцюшкі.** Раман.

72 **Уладзімір МАРУК. «Ля ціхай і светлай вады...»** Вершы.

82 **ШКОЛЬНЫЯ ДАЛЯГЛЯДЫ. Міхась Кенька.** Асаблівасці прозы малой жанравай формы. **Лада Алейнік.** Здольны... Адораны... Таленавіты... **Марыя Шамякіна.** Навела ў фантастыцы. **Юрась Нераток.** Няхай Эсквіль нам зайздросціць! Планета Раслін.

110 **Анатоль АЎРУЦІН. У дваццатым стагоддзі.** Вершы.

119 **Франчэска ПЕТРАРКА. Італія мая.** Канцона.

122 **Уладзімір СОДАЛЬ. Люцінка.**

129 **Ігар ЗАПРУДСКІ. Беларускі сіндром і асоба Кастуся Каліноўскага.**

136 **Ганна ЗАПАРТЫКА. Максім Гарэцкі. 1923 год. Хроніка адной падзеі. Да гісторыі вяртання літаратурнай спадчыны М. Гарэцкага.**

144 **Мікола КАЛІНКОВІЧ. «Ніколі, браткі, не забуду...»**

155 **Айцец Юрый МЫЦЫК. Уступ.**

175 **Генрых ДАЛІДОВІЧ. Сведкі пераломнага часу, або Пяць сюжэтаў з прадмовай і пасляслоўем.**

185 **Валянціна ЛОКУН. Пакліканыя і абраныя.**

192 **Міхась КАРПЕЧАНКА. Фенікс па-над Вабіччу.**

199 **Анатоль ЗЭКАЎ. Венікам па пісьменніках.** Эпіграмы.

201 **Метрыка літаратурная.**

**© «Полымя», 2008**

**ЗАСНАВАЛЬНІКІ — Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь;**
**грамадскае аб'яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі»;**
**рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Літаратура і Мастацтва»**

Валянціна ЛОКУН

# ПАКЛІКАНЫЯ І АБРАНЫЯ

*(Узыходжанне пісьменніцы)*

*Валянціна Коўтун.* **Пакліканыя.** Раман-жыціе. Мінск, Мастацкая літаратура, 2007.




Валянціна Коўтун — пісьменніца адметнага таленту. І не таму, што творыць у жанры дакументальна-мастацкай прозы, што піша пра далёкую і блізкую гісторыю (пра гэта ў нас многія пішуць), а найперш таму, што спасцігае філасофію гэтай гісторыі — праз спасціжэнне індывідуальнага высокага духу, які ёсць адбітак уласна нацыянальных жыццесцвярджальных ідэалаў.

Як адну з галоўных у працэсе гісторыка-культурнага фармавання гуманістычных прыярытэтаў аўтарка вылучае ідэю хрысціянскай этычнай духоўнасці. Да гэтай ідэі яна наблізілася яшчэ ў рамане «Крыж міласэрнасці». Спасціжэнне міласэрнасці ў сакральным яе значэнні як асновы быцця прывялі Алаізу Пашкевіч да хрысціянскага светаразумення. Гэта стала «духоўным прынцыпам» Цёткі — цяжкім пакутным «крыжам», які яна адчайна і годна несла на працягу свайго жыцця.

Ідэя хрысціянскай самасвядомасці як асновы духоўнага абнаўлення зямлі беларускай у рамане-жыціі «Пакліканыя» (1998—2007) загучала *дамінантна.* Гэты твор стаў лагічным завяршэннем пошукаў пісьменніцай нацыянальных духоўных прыярытэтаў. Упершыню ў беларускай літаратуры пастаўлена праблема святасці — і не толькі як праблема маральна-этычная, але і філасофская.

Як прызнаецца сама аўтарка, штуршком да напісання рамана-жыція было начное аб'яўленне ёй самой Еўфрасінні Полацкай. У тую ж ноч яна напісала і першыя старонкі твора. Пасля былі няўтольныя пошукі фактала-гічнага матэрыялу: летапісныя звесткі, гістарычныя працы М. Карамзіна, М. Мікалаева, шматлікія даведнікі і энцылапедыі, царкоўныя жыцціі ігуменні, працы філосафаў і тэолагаў XII стагоддзя і г. д. Да ўсяго ў рамане шырока выкарыстоўваюцца і асобныя выказванні з «Новага запавету», Псалтыра, «Аповесці Жыцця і Смерці святой блажэннай і найпадобнейшай Еўфрасінні, ігуменні манастыра Святога Спаса і найсвяцейшай Ягонай Маці, што ў Полацку» і г. д.

Полаччыны не ўсіх задавальняла. Полацк стаў «парушынай» у воку кіеўскіх князёў, асабліва магутнага Мсціслава. Ішлі таемныя перамовы Кіева з князямі дрыгавічанскімі і палянскімі, на фоне чаго абвастрыліся сутыкненні паміж мінскім Расціславам і полацкім Рагвалодам. З другога боку, крывічам пагражалі ноўгарадцы. З захаду каралеўскія дарадцы ціснулі на напалову паганскую суседнюю дзяржаву. А яшчэ былі нахабныя набегі хана Баняка, пасля чаго заставаліся адно пажарышчы і смерць дзесяткаў крывічоў. Не лепшай была сітуацыя і ўнутры Полацка: памацнела варажнеча паміж полацкімі князямі Давыдам і Барысам. Такім чынам, Полацк спешна рыхтаваўся да абароны.

Атмасфера міру, напружаная, неспакойная, змяняецца выразнымі малюнкамі бесперапынных крывавых войнаў і сутыкненняў за княжыя стальцы, калі, кажучы словамі аднаго з персанажаў, нібыта сам «Іспра з пекла вылез і ўсё перавярнуў на свеце». Крывіцкая зямля была ўсеяна трупамі ратнікаў Рагвалода і Давыда. Здавалася, па ўсім свеце распаўзлося адно зло, «цемра чалавечая», і гэта было страшней за чуму, хваробу цялесную, якая ў той год забрала тысячы чалавечых жыццяў.

Ідэя барацьбы дабра і зла закладзена ў прыродзе, створанай Самім Творцам. Дабро і зло — пачаткі субстанцыянальныя, узаемазвязаныя. На тэзу павінна быць антытэза. Гэта — закон, і ён пакладзены ў аснову Сусвету. Улада, паводле Валянціны Коўтун, — зло абсалютнае. Праблема ўлады — адна з цэнтральных у творы. Перагортваючы адна за адной старонкі крывавых бітваў за княжы сталец, пісьменніца імкнецца высветліць «тую вялікую таямніцу, якую тоіць у сабе д'ябальская спакуса ўлады і ўсялякая магчымасць быць мацней за іншага чалавека. І мацней настолькі, што можна нават забраць у супраціўніка дар Боскі — жыццё». Рух айчыннай гісторыі — гэта трагічны рух. Д'яблам спакушаныя, людзі праліваюць кроў за ўладу, забываючы аб тым галоўным, што «мы здавён — сейбіты. Арачы-вернікі мы. І прадзеды нашы, ад зямлі, займаліся таржышчам хлеба і запальвалі паходні на свята свяшчэннага плуга. Ворнікі-скалоты мы!..» Людзі нібыта «адракліся» ад сваёй спрадвечнай сутнасці. Яны забыліся пра дух, якім усё наталяцца павінна. Забыліся пра «меч духоўны, які ёсць Слова Божае».

Ідэя любові як ідэя Бога праходзіць лейтматывам праз усю апавядальную прастору твора. «Бо нічога не ўзрастае на зямлі гэтай без любві»; любоў усюдыісная, «ці на неба чалавек узыдзе — і там любоў. І ў апраметную рыне — любоў знойдзе. Уладжана любоў і ў чэраве маці тваёй». Без любові чалавек «як хваля… якую вецер гоніць, распырсквае».

Любоў, паводле Валянціны Коўтун, галоўная «рухальная» сіла, яна дае «вецер і агонь ратавальны. Сыпле снег, яе попел. Мацуе завалы ў брамы свае… Дабраслаўляе сыноў нашых сярод неба… Пакрывае неба аслонамі. Рыхтуе зямлі спорны дождж. Расціць на горах траву. Дае жывому ўсяму на зямлі пашу ягоную». Такім чынам, любоў — паняцце сакральнае. Гэта абсалютны стваральны пачатак. Менавіта ён і пакладзены ў аснову Сусвету.

Валянціна Коўтун славіць не Бога абстрактнага, а Бога-Чалавека, субстанцыянальнага Бога. Боскі пачатак, або сфера Бога — не па-за чалавекам, а ўнутры чалавека. «Сказана: прыйдзі да сябе і прыйдзеш да Айца нябеснага».

Катэгорыя Бога ў прозе пісьменніцы ёсць у значнай ступені катэгорыя маральнага, ці, кажучы па-руску, *нравственного* плана. Гэта — сфера высокага духу.

Свет і чалавека ўратуюць толькі безумоўныя хрысціянскія імператывы: ветхазаветнае «не забі» і евангельскае «не супраціўся злу». Любоў, міласэрнасць, усёдаравальнасць — ёсць моманты этычнай праграмы аўтара «Пакліка-

ных». Яны пакладзены ў аснову катэгорыі святасці, якая мае глыбокі сакральны змест. І гэта не абстрактная філасафема, праграма гэтая «матэрыялізуецца» ў вобразе галоўнай гераіні Еўфрасінні Полацкай — адной з «пакліканых». І адзінай «абранай».

Полацкая ігумення, напрыканцы свайго доўгага манаскага жыцця апынуўшыся на святой зямлі Галілеі, «усё ўзіралася ў пачварныя валы і нізкія ўсклочаныя хмары, нібыта намагалася ў смяротнай кудасе разглядзець і разгадаць тое спрадвечнае, да чаго яна гэтак адчайна і доўга, праз усё сваё жыццё, спяшалася». Яна просіць у таго, каму амаль усё жыццё аддана служыла, дазволу пусціць «кола памяці праз жыццёвы круг, бо ўжо гатова сэрца маё». І яна «ўсё ніжэй апускала голаў у пякучую памяць». Гэта ёй было неабходна яшчэ і для свайго ўнутранага падсумавання. Ёй хацелася, перш чым навечна растварыцца ў вялікім духоўным космасе, яшчэ раз дакрануцца да таго зямнога, «чалавечага», людскага, якое трымала яе ў сваім палоне, хоць здавалася, што ўсё даўно забыта, «прамінула і адышло ў нябыт». І яна ўзіралася, усё глыбей і глыбей, — у тыя далёкія часіны, калі яна, князёўна, дачка відбескага князя Святаслава-Георгія, унучка Уладзіміра Манамаха, зродніца князёў вялікіх полацкіх Барыса і Рагвалода, лёгка хадзіла па яркай раскошы травы, слухала раку, спевы птушак. Яе, манахіню, нібыта нехта настойліва клікаў, гукаў у далёкую маладосць, калі ўсе яны, вучні Данілавы, пакляліся не пакідаць адно аднаго «ні ў агні, ні ў вадзе...», або, калі яе, юніцу збіраліся выдаць замуж за смаляніна Дабраслава... То зноў, у каторы раз, яна вярталася ў вузенькія сцены сафійскай галубіцы. Мяккі ветрык бясконцай Іудзейскай пустыні «лёгка перагортваў манускрыпты яе ўласнага, такога доўгага і няпростага жыцця».

Валянціна Коўтун з самага пачатку адмовілася ад ідэалізацыі вобраза Еўфрасінні (як, дарэчы, і іншых сваіх герояў). Зямное, цялеснае моцна трымалі яе ў сваім палоне, але яна ўпарта адмаўлялася ад усіх радасцей зямных, бо іншае мела зрабіць. Ды і наогул, «слава зямная — прах і попел. Знікае, як падманная пара. І горш павуціння аблытвае людзей. Слабасці плоці часам мацней за сілу духу».

Яшчэ юніцай Еўфрасіння (у міры Прадслава) далучалася да кніжных навук, вывучала мовы, у тым ліку і грэцкую, у пісца Данілы. У кнігах шукала яна паратунку для сваёй душы. «Кніжкі, як сонейка ўдзень. Як месяц уначы... Кніжкі — гэта Гасподзь, які ёсць — Слова». З асаблівай пашанотай ставілася гераіня да вялікай святой Еўфрасінні Александрыйскай. Думкамі яе валодалі людзі моцныя духам, жанчыны, якія, «прыняўшы моц мужчынскую, адсеклі ад сябе грахі і слодычы зямныя мечам», якія «не з жалеза, а з моцнага духу. І імёны іх напісаны на нябёсах». І Прадслава-Еўфрасіння авалодвала гэтым «мечам», «упітвала» ў сябе моц духу, які ўліваўся ў яе з высокага неба, з роднай зямлі. Яна хацела быць падобнай да тых чатырох жаночых постацей, якія ўбачыла на мініяцюры манаха з Рыма. Жанчыны схіліліся перад тронам «Свяшчэннай Рымскай імперыі». Кожная з іх была адорана сваім духоўным космасам. Усе яны былі апякункамі. Еўфрасіння бароніць *сваю* духоўную прастору, непадобную да іншых. Яна перакананна, што ласкаю Боскаю напоўнена зямля. Ласкай і любоўю. Толькі ўсе мы, людзі, грахамі спакушаныя, таму «той, хто хоча ісці за Мной, няхай адлучыць сябе ад іншага, возьме свой крыж і кожны дзень ідзе...».

Яшчэ ў дванаццацігадовым узросце юная княжна пакінула шыкоўны палац бацькі свайго і прыняла манаскі пострыг. З гэтага моманту і пачаўся яе цярністы шлях — шлях бясконцых выпрабаванняў і бесперапыннай малітвы. Шлях самаахвяравання і самаадрачэння. Шлях да горніх вышынь.

Сілы нябесныя зрабілі Еўфрасінню відушчай, а повязь з зямлёю зрабіла яе адчувальнай да болю чужога. Яна чула «развярэджаны стогн параненай зямлі» і боль людзей — жывых і нават памерлых. Душы памерлых таксама звярталіся да яе, яны крычалі, прасілі яе дапамогі, заступніцтва — перад Ім, Вышэйшым. І Еўфрасіння малілася, ратавала жывых і памерлых ад паганскага агню. Маліла Бога аб літасці да ўсіх, «нікому не вядомых, прыплылых на ладдзях і чаўнах», да тых, «чые целы з баявымі ранамі ці чорнымі дзірамі д'яблавай чумы ляжалі цяпер на колах», да ўсіх гвалтам загубленых. Нібыта ўвесь боль свету ўліваўся ў яе спакутаваную малітвай душу. І гэты чужы боль рабіўся яе ўласным. Ён паласаваў яе цела з новай і новай сілай. А яна прасіла ўсё новых і новых выпрабаванняў, бо менавіта ў іх бачыла сваё і ўсяго роду чалавечага ратаванне.

У рамане ўразліва адлюстравана дзея, якая разгортваецца на паганскім капішчы ў пушчы. Гэта першая сур'ёзная сутычка Еўфрасінні з вешчуном Вікулаю. Менавіта тут, пры пахаванні ахвяраў чумы, яна атрымлівае і сваю першую псіхалагічную перамогу. Яна, маладая і нявопытная манашка, у вострым дыялогу з вешчуном і смердамі паварочвае сітуацыю на свой бок.

Вызначэнне чумы, дарэчы, мае не толькі канкрэтнае значэнне, але і глыбокі метафарычны змест. «Іншая чума, цемра чалавечая паўсюль распаўзлася». І яна горшая за хваробу цялесную.

Плывуць па веснавой Дзвіне плыты пад чорнымі вятрыламі. На іх не толькі тыя, каго знішчыла чума, а і тыя, што палеглі падчас бойкі з ханам. Еўфрасіння мужна прымае на сябе ўдары персаніфікаванай чумы, а яшчэ — усіх тых, хто імкнецца за грошы купіць Боскую літасць і аздараўленне.

Метафара чумы па-філасофску ўскладняецца сцэнай веснавой паводкі і дзікімі паводзінамі супраціўнікаў хрысціянства — укрыжаваннем бельчыцкага святара на кургане капішча. Менавіта пасля пахавання святара ў душу Еўфрасінні пачало ўлівацца новае пачуццё — бязмежнае адчуванне ўласнай сілы, «уладнай над мыслямі» чалавечымі.

І нарэшце сакральная сцэна-відзеж — наказ Анёла збудаваць манастыр: «Ідзі ў Сяльцо, сястра. І збудуй там дом Уладара нашага. І зрабі прытулак для абранніц Яго! І будзь ім сэрцам, розумам. І ўціхамірвай люд свой, і не дай кроплям крыві ракою стаць. І наступі на галаву злога раба і працістой дзёрзкасці яго акаяннай». Манастыр задумваўся як цэнтр духоўнай кансалідацыі і прымірэння славянскіх народаў. Яму надавалася вялікая роля ў распаўсюджванні хрысціянскіх маральна-этычных прыярытэтаў. Перадача метахіі адбылася 19 жніўня 1126 года.

Ідэя любові да чалавека праз любоў да Бога закладзена ў аснову характару Еўфрасінні. Менавіта ўсёдаравальнасцю кіравалася гераіня, калі прасіла епіскапа «вызваліць смердаў тых, якія на капішчы не ведалі, што дзеюць», і Кірыка, «у імя Госпада, чые раны адкупілі грахі нашыя». І тады, калі спускалася ў знакамітую на ўсёй Полаччыне вязніцу, дзе сядзелі самыя жорсткія забойцы і рабаўнікі. І тады, калі ратавала ад несвабоды і здзеку звар'яцелую Веранію…

Гераіня Валянціны Коўтун — не меншая за шэкспіраўскага героя: і па ўнутраным багацці і разнастайнасці душэўнага стану. Гэта вобраз сакральны ў беларускай літаратуры. Нароўні з вобразамі Міхала («Новая зямля» Якуба Коласа), Васіля Дзятліка («Палеская хроніка» Івана Мележа), Сцепаніды Багацька («Знак бяды» Васіля Быкава) Валянціна Коўтун прапануе грамадскасці «мадэль» беларускага хранатопа, які мае сваю сістэму каштоўнаснага вымярэння, — абсалютная арыентацыя на хрысціянскае светаадчуванне. Еўфрасіння Полацкая — асоба адраджэнскага

кшталту. З шэрага вядомых — Скарына, Будны, Цётка. Але яна і адрозная ад іх — праз сваю святасць. Яна не толькі «пакліканая», але і «абраная». Яна пакутніца, якая, падобна Настаўніку, імкнецца ўзяць на сябе грахі чалавечыя. І пры ўсім гэтым яна, як з'ява мастацкая, захоўвае «непадзельную сутнасць».

Ступіўшы на цвёрдую зямлю Галілеі, Еўфрасіння ўпэўнілася, што ёй, ужо немаладой Хрыстовай служцы, было неабходна прайсці апошні жыццёвы круг па слядах Госпада, «каб ісці як з заплюшчанымі вачамі, але — відушчаю… Думаць аб заўтрашняй сустрэчы і загойваць у сваёй душы раны сустрэч колішніх». Нешта глыбіннае перайначылася ў яе душы на зямлі галілейскай, асабліва пасля наведвання галілейскага шпіталя. «Я… адтуль, скуль і ты», — пачула яна словы паланянкі. Нібыта па-новаму, з абвостранай сілай, адчула Еўфрасіння сваю кроўную повязь з далёкай цяпер Полаччынай. Яна стала адказнай за родную зямлю. І не толькі за тую, што была, а і за тую, што будзе. За народ свой! «Каб ацалеў».

У другой кнізе рамана акцэнты крыху змяшчаюцца, аўтар больш увагі надае акружэнню полацкай манашкі. Побач з Еўфрасінняй выпісаны шэраг «жыцій», дакладней, жыццяпісаў, якія маюць свае асобныя апавядальныя лініі — з тым, каб у рэшце рэшт перасячыся або зліцца з галоўнай лініяй — лініяй полацкай манашкі.

Няпростым быў шлях духоўнага ачышчэння Звеніславы, якая хацела піць адначасна і чару Гасподню, і чару дэманскую ці мінскай князёўны Вольгі. Або ігумена Міхала і іншых.

Уражваюць сваім трагічным зместам вобразы Алмы, Веранії, жмудзінскага купца Кірыка. Альбо сляпога Ерынея, які больш за іншых прагне пакаяння: «Аднаго ў Госпада прашу. Снегу сабе паболей. Ільдоў аслізлых паболей». Усе яны — людзі спакушаныя: страсцямі зямнымі, уладай ці д'ябальскай сілай. Кожны па-свойму, але спакушаныя. Усе яны, высільваючыся, імкнуцца прайсці праз сваю «пустыню жыцця», прайсці праз свой шлях ачышчэння. Іх характары і паводзіны, індывідуальная свядомасць дапаўняюць малюнак гістарычнага часу, падкрэсліваюць яго супярэчлівасць, процістаянне розных грамадскіх і прыродных сіл. Усе яны нясуць на сабе цяжар неўладкаванасці свету. Як і Еўфрасіння. Толькі іх шлях да ісціны больш грахоўны і заблытаны. Адсюль і больш драматычны.

Шлях у Іерусалім — гэта пакутны ачышчальна-спавядальны шлях. Шлях бясконцых выпрабаванняў і жыццёвых падсумаванняў. «Шах… Шах… Шах…» Аднастайнае шархаценне пяску стала нібыта голасам самой пустыні, яе камертонам. «Менавіта гэтае камертонавае шаханне гарачай галілейскай прасторы, сімвалізуючы няўпынны рух чалавека праз пустыню жыцця да Госпада, стала суправаджаць палачан праз усю іх доўгую, перапоўненую перашкодамі, дарогу», — адзначыць пісьменніца ў сваім каментары да кінарамана «Спасам пакліканыя».

Менавіта тут, на святой зямлі Іерусаліма, завяршаюцца полацкія «жыццяпісы».

Валянціна Коўтун пабудавала твор адмысловы па сваёй унутранай структуры. Сны, трызненні, мроі адыгрываюць важную ролю ў структуры вобразаў. Як і ўвогуле ў апавядальнай прасторы твора. Але ўсё гэта не зніжае рэальна-жыццёвага напаўнення рамана. Наадварот, падкрэслівае яго канкрэтна-гістарычны змест. Рэальнае суадносіцца з містычным, дзе асаблівая роля адводзіцца цудам Еўфрасінні. Цуды манашкі выразна праявіліся падчас будавання царквы Святога Спаса і выгнання д'ябла з князёўны Вольгі («Агненніцы»), а пасля і з галілейскай паломніцы Алмы. Гэта паспрыяла адметнасці характару Еўфрасінні, зрабіла яе адной з самых загадкавых асоб свету.

Раман «Пакліканыя» мае глыбокі містычны змест, які праяўляецца, як адзначыла сама аўтар, у «малітоўнай узаемасувязі ігуменні Еўфрасінні з Маці Божай, збаўцам, містычнай «прысутнасці» сакральных супраціўнікаў: Анёла срэбракрылага і Пасланца д'ябла... Асобная старонка ў гэтым кантэксце адводзіцца містычным прывідам Іудзейскай пустыні — персаніфікаваным ветру Хасіну і Змію Галаадскаму».

Вобразы ветру, шторму маюць сімволіка-метафарычнае значэнне. Гэта вобразы-канцэпты, яны люструюць быццёвую энергетыку, скіраваную супраць чалавека. «Усё жыццё наша, як пустыня... Ідзем і бясконца абдзіраемся да крыві». Пустыня — гэта таксама прыродная стыхія, якая зноў і зноў выпрабоўвае герояў — фізічна і духоўна. Зусім як біблейскае: «Тады Ісус быў зведзены Духам у пустыню, на спакушэнне ад д'ябла». Гукі пустыні ўспрымаюцца як гучанне свету. Толькі не гарманічнага, да перадачы якога імкнулася сусветная літаратура, а дысгарманічнага, свету д'ябальскага, антысвету.

Калі працягваць гаворку пра адметнае, то трэба адзначыць і мову, якая стылізавана пад узоры старажытнай, што стварае эфект адмысловага першабытнага душэўнага настрою, эфект прысутнасці гістарычнага часу.

У свой час Ала Сямёнава, маючы на ўвазе раман «Крыж міласэрнасці», адзначыла, што ў прозе Валянціны Коўтун «усё па максімалісцкай сістэме каштоўнасцей, дзе мастацкае павінна сысціся з даследчым, дакументальным, фактаграфічным, дзе строгая логіка думкі павінна спалучацца з натхнёнымі фарбамі і мелодыямі душы, увасобленымі ў канкрэтных радках і адчувальнымі ў водары часу, у сувязі галоўнага і нібыта нязначнага, што, аднак, мецiць непадробнасць і вышыню жыцця. Жыцця ў розных яго праявах». Гэтым жа мастацкім крэда кіравалася пісьменніца і пры напісанні «Пакліканых».

Пераканана, што раман «Пакліканыя» зойме пачэснае месца ў шэрагу адметных узораў нацыянальнай прозы і ўвогуле еўрапейскай літаратуры — па сваіх высокіх мастацкіх якасцях, па глыбіні і шматбаковасці ў адлюстраванні вобразаў Часу і Асобы. Гэтым творам Валянціна Коўтун адкрыла новыя магчымасці дакументальна-мастацкай і інтэлектуальнай прозы, набліжаючы яе да жанру жыція. Раман паядноўвае, сінтэзуе ў адно мастацкае цэлае гісторыю, дакумент, літаратурнае ўяўленне як «волю да звышбыцця» (Г. Башляр), элементы «Жыція» і моманты попкультуры — дэтэктыў. Займальнасць сюжэта, нязвыкласць тэматыкі, стылёвыя эксперыменты — усё гэта паслядоўна і арганічна скіравана на выяўленне жыццёва важных, быційных праблем беларускага народа, беларускага этнасу. Але нават не гэта галоўнае. Пісьменніца адкрывае незвычайную для беларускай літаратуры філасофскую тэму — тэму святасці. Яе раман-жыціе змяшчае ў сабе новыя маральна-этычныя арыенціры, сцвярджае веру ў Чалавека светлага, «пакліканага» і «абранага».